# Жыццё ў авіяцыі

## ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. К. СПІРЫДЗЕНКІ

НАША перапіска была нядоўгай. Герой Савецкага Саюза генерал-маёр авіяцыі Спірыдзенка першае пісьмо прыслаў у сакавіку 1976 года. Адказаць на апошняе пісьмо, якое я даслаў яму 15 снежня 1980 года, Мікалай Кузьміч не паспеў: 26 снежня яго не стала...

Ён узначальваў савет ветэранаў 309-й авіяцыйнай дывізіі, шмат выступаў перад маладымі воінамі, рабочымі, студэнтамі. Разам з навучэнцамі 487-й сярэдняй маскоўскай школы ўдзельнічаў у стварэнні музея, прысвечанага аднапалчаніну Герою Савецкага Саюза І. М. Астахаву. Свае ўспаміны аб Вялікай Айчыннай вайне Мікалай Кузьміч напісаў ужо ў шпіталі, у падмаскоўным Архангельскім.

...30-я гады ў жыцці нашай краіны былі часам, калі моладзь захаплялася авіяцыяй. «Убачыўшы самалёт, які пралятаў над нашымі месцамі, я «захварэў» небам, — успамінаў генерал Спірыдзенка. — Нягледзячы на адгаворы родных і блізкіх, цвёрда вырашыў стаць лётчыкам. І хачу сказаць, што не памыліўся ў сваім выбары. Авіяцыя прынесла мне радасць, шчасце палёту, хаця, зразумела, было і нямала цяжкасцей у жыцці».

Камсамол накіраваў Мікалая на вучобу ў Віцебскі аэраклуб. Пасля яго заканчэння былі гады вучобы ў Барысаглебскай ваенна-авіяцыйнай школе лётчыкаў. У пасляваенныя гады М. К. Спірыдзенка закончыў Ваенна-паветраную акадэмію, Акадэмію Генеральнага штаба.

...1939 год. Стаялі марозныя студзеньскія дні, калі выпускнік лётнай школы лейтэнант Спірыдзенка прыбыў да месца службы ў 49-ы авіяполк. «Гэты полк, які размяшчаўся паблізу ад Пскова, стаў для мяне другім домам. У лётнай школе я атрымаў права лятаць, а ў палку стаў прафесіянальным ваенным лётчыкам», — пісаў Мікалай Кузьміч, адказваючы на пытанне аб пачатку сваёй службы ў авіяцыі.

Баявы шлях лётчыка пачаўся ў снежні 1939 года, калі іх полк перакінулі на савецка-фінляндскі фронт. М. К. Спірыдзенка здзейсніў 96 баявых вылетаў і камандаваннем Ленінградскай ваеннай акругі быў прадстаўлены да ўрадавай узнагароды. 21 мая 1940 года лейтэнант Спірыдзенка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

— Гэтую надзвычай дарагую для мяне ўзнагароду ўручыў мне асабіста Калінін, — успамінаў Мікалай Кузьміч.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны лётчык Спірыдзенка сустрэў паблізу ад латвійскага горада Даўгаўпілса. Дарэчы, тут, на беразе Даўгавы, яго бацька Кузьма Герасімавіч у гады першай сусветнай вайны атрымаў цяжкае раненне. Выратаваў яго аднавясковец Харытон Іванавіч Грыбаў. Праз многа год, у чэрвені 1941 года ўжо сыну Кузьмы Герасімавіча, ваеннаму лётчыку Мікалаю Спірыдзенку давялося над Даўгавай, паблізу ад горада ўступіць у першую сутычку з фашыстамі. «Бой быў цяжкім,— напіша потым генерал, успамінаючы свой першы бой у гады Вялікай Айчыннай, — і скончыўся ён тым, што вораг вымушаны быў збегчы, недалічыўшыся трох сваіх бамбардзіроўшчыкаў, якіх мы збілі над Даўгаўпілсам».

Пачаўшы ваяваць з гітлераўцамі ў Латвіі, М. К. Спірыдзенка прымаў потым удзел у паветраных баях на Паўночным і Паўднёва-Заходнім, Заходнім і 2-м Беларускіх франтах. Кавалерам двух ордэнаў Чырвонага Сцяга, ордэна Суворава 3-й ступені ступіў ён на родную беларускую зямлю.

14 ліпеня 1944 года васьмёрка нашых ЛА-5 была ўзнята ў паветра для суправаджэння самалётаў ІЛ-2, якія ляцелі для выканання баявога задання за лінію фронта.

Успамінаючы гэты баявы эпізод, генерал-маёр Спірыдзенка дадае, што ў тыя дні іх полк размяшчаўся на аэрадроме паблізу ад гарадка Жалудок, што ў Гродзенскай вобласці. «Усе спробы варожых знішчальнікаў атакаваць нашы штурмавікі мы адбілі. І такім чынам далі магчымасць нашым лётчыкам-штурмавікам нанесці магутны агнявы ўдар па варожаму аб'екту».

Далей Мікалай Кузьміч успамінаў, што на зваротным шляху ён заўважыў варожыя бамбардзіроўшчыкі. У суправаджэнні знішчальнікаў яны ішлі да лініі фронта. Бамбіць пазіцыі нашых войск фашысты не сталі, а пайшлі ў наш тыл. Тады Спірыдзенка з двума вядомымі атакаваў 22 бамбардзіроўшчыкі і 12 знішчальнікаў ворага. З боку сонца ён разам з лейтэнантамі Аляксеем Розінавым і Аляксандрам Смольнікавым пайшлі ў атаку на фашысцкія самалёты. Спірыдзенку ўдалося збіць самалёт вядучага. Другі варожы самалёт збіў Аляксей Розінаў.

На выхадзе з атакі маёр Спірыдзенка заўважыў, што яго вядомаму Аляксандру Смольнікаву пагражае смяротная небяспека. Мікалай Кузьміч смела кінуў свой ЛА-5 насустрач варожаму ФВ-190 і прашыў яго меткай чаргой. За ажыццяўленне гэтага баявога вылету Мікалай Кузьміч Спірыдзенка быў узнагароджаны камандаваннем 4-й паветранай арміі ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

У архіўнай справе Героя Савецкага Саюза М. К. Спірыдзенкі захоўваецца прадстаўленне яго да вышэйшай ступені адзнакі. У ім гаворыцца: «...намеснік камандзіра авіяцыйнага знішчальнага палка маёр М. К. Спірыдзенка з 22.VI.1941 г. па 22.XI.1944 г. здзейсніў 337 баявых вылетаў, удзельнічаў у 85 паветраных баях, збіў асабіста 15 самалётаў праціўніка і 6 у саставе групы».

Радзіма высока ацаніла ратныя справы адважнага лётчыка — Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 лютага 1945 года Мікалаю Кузьмічу Спірыдзенку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Гэтая радасная навіна застала яго ўжо ў сценах Ваенна-паветранай акадэміі. Пасля заканчэння вучобы ў акадэміі Мікалай Кузьміч яшчэ дваццаць гадоў служыў у авіяцыі. Ён прайшоў шлях ад камандзіра палка да начальніка кафедры ваеннай акадэміі імя Ф. Э. Дзяржынскага. У запас пайшоў у званні генерал-маёра.

...Героя няма з намі. Але жывуць у памяці народа, удзячных нашчадкаў яго баявыя подзвігі. М. К. Спірыдзенка многа зрабіў для перамогі над гітлераўцамі, для ўмацавання абароннай магутнасці Краіны Саветаў. І сёння, адзначаючы 70-гадовы юбілей з дня нараджэння М. К. Спірыдзенкі (ён нарадзіўся 12 студзеня 1917 года), мы ганарымся, што Мікалай Кузьміч — наш зямляк. Яго імя назаўсёды ўвайшло ў гісторыю Ленінскага камсамола Беларусі.

**Н. САЛАЎЕЎ,**
**старшы лейтэнант запасу.**